# ПУБЛІЧНАЯ ЗАЯВА VIEŠOJI ĮSTAIGA BEROC TYRIMŲ CENTRAS ДЛЯ ГРАМАДСКАСЦІ ЛІТВЫ

**Чаму мы робім гэтую публічную заяву?**

Даследчы цэнтр BEROC (Viešoji įstaiga BEROC tyrimų centras) нядаўна сутыкнуўся з хваляй нападак і інсінуацый адносна сябе і сваіх ключавых супрацоўнікаў. Мы ў поўнай меры не разумеем матывацыю і прыроду гэтых з'яў. Аднак гэта першы падобны інцыдэнт за 15-гадовую гісторыю дзейнасці BEROC.

Мы заўсёды працавалі на прынцыпах адкрытасці і празрыстасці, дзякуючы чаму, спадзяемся, мы здолелі заваяваць аўтарытэт у акадэмічнай і даследчай супольнасці, грамадзянскай супольнасці Беларусі, а таксама сярод міжнародных партнёраў.

Мы разглядаем інсінуацыі ў адрас BEROC як прэцэдэнт, які можа выліцца ў небяспечную тэндэнцыю для адносінаў літоўскай і беларускай грамадзянскай супольнасці. Мы мяркуем, што такая тэндэнцыя павінна быць спынена. Мы лічым, што такія інсінуацыі могуць быць выгадныя сілам, якія не жадаюць Беларусі будучыні незалежнай дэмакратычнай і еўрапейска арыентаванай краіны. У сувязі з гэтым мы хацелі б даць літоўскай грамадскасці тлумачэнні адносна мэтаў і фармату дзейнасці нашай арганізацыі ў Літоўскай Рэспубліцы.

Найперш мы хочам падкрэсліць нашу падзяку і вялікую павагу да Літвы, яе дзяржаўных інстытутаў, грамадзянскай супольнасці, культурнай і акадэмічнай супольнасцяў за падтрымку і дапамогу дэмакратычных памкненняў беларусаў, абарону тых, каму на радзіме пагражаюць рэпрэсіі, і стварэнне спрыяльных умоваў для бізнэсаў беларускага паходжання, якія вымушана рэлакаваліся з Беларусі. Ўсё гэта заахвоціла нас, будучы ў вымушаным выгнанні, інстытуцыяналізаваць сваю дзейнасць менавіта ў Літве.

Цяперашні перыяд - пакуль у Беларусі захоўвае свае пазіцыі дыктатура пры падтрымцы агрэсіўнага імперскага рэжыму ў Маскве, а некалькі тысяч удзельнікаў пратэстаў знаходзяцца ў турмах пад ціскам рэжыму, калі прыхільнікі дэмакратычнай будучыні Беларусі падвяргаюцца рэпрэсіям - насуперак сваёй складанасці можа і павінен быць прадуктыўна выкарыстаны. Па-першае, для выратавання чалавечага капіталу Беларусі. Па-другое, для стварэння падмурку будучыні - дэмакратычнай Беларусі ў Еўрапейскім саюзе, якая будзе надзейным партнёрам і сябрам для сваіх суседзяў і перш за ўсё для бліжэйшага з іх - Літвы, а не небяспечным для рэгіёна сатэлітам Расіі.

Мы мяркуем, што адносіны дэмакратычнай Беларусі з Літвой маюць надзвычайную важнасць для будучыні ўсяго рэгіёну – яго стабільнага развіцця і устойлівай бяспекі. Таму ў сваёй сённяшняй дзейнасці наша арганізацыя рэалізуе праекты ў адукацыйнай і даследчай галінах, а таксама спрыяе развіццю бізнес-супольнасці. Гэта дзейнасць, мы ўпэўнены, ужо сёння носіць узаемавыгадны характар як для беларускай грамадзянскай супольнасці, так і для літоўскага грамадства і краіны агулам.

**Што такое даследчы цэнтр (Viešoji įstaiga BEROC tyrimų centras) і што ён робіць у Літве?**

Даследчы цэнтр BEROC (Belarusian Economic Research and Outreach Center) – беларускі даследчы цэнтр, які быў створаны у партнёрстве і пад патранажам Stockholm Institute of Transition Economics (SITE) у 2008 г.

BEROC вызначаў свою місію як спрыянне развіццю рынкавай эканомікі ў Беларусі шляхам стварэння грамадскага дыялогу на падставе эканамічнага аналізу і экспертызы высокай якасці; трансляцыя міжнародных акадэмічных каштоўнасцяў праз правядзенне даследванняў і адукацыйных праграм міжнароднага ўзроўню у галіне эканомікі. На практыцы гэта азначала

спрыянне дэмакратычнай трансфармацыі Беларусі праз сферу эканомікі і бізнесу для ўсталявання ў краіне сучасных стандартаў рынкавай эканомікі і эканамічнай палітыкі, вяршэнства закону, правоў і свабод чалавека, дэмакратыі.

Да 2020 г. BEROC здолеў прайсці значную частку гэтага шляху, трансфармуючы сацыяльную сераду ў Беларусі праз эканамічныя даследванні і адукацыю, а таксама развіццё прыватнага сектару. Праз адпаведныя сферы мы максімальна садзейнічалі збліжэнню і пасіленню ўзаемасувязяў Беларусі з Еўрапейскім Саюзам.

Досвед нашых партнёраў з цэнтраў акадэмічных даследаванняў, аналагічных BEROC, якія ў партнёрстве і пад патранажам SITE былі таксама створаны ў Польшчы (CenEA), Латвіі (BICEPS at SSE-Riga), Украіне (Kyiv School of Economics), Грузіі (ISET), паказваў на тое, што мы на правільным шляху. Шматгадовая дзейнасць BEROC зрабіла свой уклад у той запыт беларускага народа на дэмакратычны транзіт, які прывёў да беспрэцэдэнтных мірных пратэстаў у Беларусі ў 2020 годзе. Як вядома, волі народа беларускія ўлады супрацьпаставілі брутальны гвалт, масавыя рэпрэсіі супраць грамадзянскай супольнасці і падтрымку поўнамаштабнай агрэсіі імперскай Расіі супраць Украіны.

У сітуацыі вострага палітычнага крызісу пасля фальсіфікацыі выбараў і беспрэцэдэнтнага па ўзроўню гвалту прыгнечання пратэстаў, нягледзячы на знаходжанне прафесійнай экспертызы цэнтра па-за межамі палітычнага поля, BEROC выразна заявіў сваю пазіцыю аб прыхільнасці дэмакратычнаму транзіту. Адміністратыўны дырэктар Павел Данэйка, а таксама старэйшы даследчык Дзмітры Крук разам з 40 іншымі аўтарытэтнымі прадстаўнікамі грамадзянскай супольнасці з моманту стварэння (20 жніўня 2020 г.) увайшлі ў Каардынацыйную раду Беларусі – прадстаўнічы орган, створаны па ініцыятыве Святланы Ціханоўскай для пераадолення палітычнага крызісу, а таксама абароны суверэнітэту і незалежнасці Беларусі.

Даследчыкі BEROC у сваіх публічных каментарах ужо са жніўня 2020 г. падкрэслівалі, што сілавое прыгнечанне дэмакратычнага транзіту – гэта шлях у імперскія абдымкі Расіі і вырак перспектывам развіцця незалежнай Беларусі. Шмат супрацоўнікаў цэнтру, апроч гэтага, аказвалі і іншае садзейнічанне дэмакратычнаму транзіту.

Пасля падаўлення актыўнай фазы пратэстаў у 2021 г. рэжым пачаў зачышчаць поле грамадзянскай супольнасці. BEROC і ягоныя супрацоўнікі падвергліся нападкам з боку рэжыма аднымі з першых. Рэпрэсіі і пагрозы вымусілі частку ключавых супрацоўнікаў выехаць з Беларусі в мае-ліпені 2021 г. Апафеёзам кампаніі рэпрэсій у ліпені 2021 г. сталі вобшукі ў офісе BEROC, дамах супрацоўнікаў, а таксама прымушэнне да ліквідацыі BEROC як юрыдычнай асобы ў Беларусі. Практыку прымусовай ліквідацыі де-юрэ рэжым выкарыстоўваў адносна больш за 1200 арганізацый грамадзянскай супольнасці, якія дзейнічалі да лета 2021 г.

З супрацоўнікаў BEROC ніхто не быў арыштаваны толькі таму, што да таго моманту яны ўжо пакінулі Беларусь. Пасля вымушанай рэлакацыі ў 2021-2022 гг. BEROC вёў дзейнасць на базе пагаднення аб супрацоўніцтве са сваёй партнёрскай арганізацыяй – Кіеўскай школай эканомікі – ва Ўкраіне.

Пачатак поўнамаштабнага ўварвання Расіі ва Ўкраіну і прамая небяспека для жыцця і здароў’я супрацоўнікаў і членаў іх сем’яў (частка з іх жылі ў Бучы і Ірпені) вымусілі BEROC да чарговай рэлакацыі. Пасля пачатку вайны ў 2022 г. супрацоўнікі BEROC апынуліся ў розных суседніх з Украінай краінах. Гэта ўскладніла дзейнасць цэнтру, але нават у гэтых умовах нашы даследчыкі працягнулі рыхтаваць якасную экспертызу.

На ўзроўні арганізацыі паўстала пытанне аб новай інстытуцыяналізацыі і рэгістрацыі адпаведнай юрыдычнай асобы. Пасля дыскусій унутры арганізацыі было прынята рашэнне аб тым, каб зрабіць новым цэнтрам дзейнасці горад Вільнюс і зарэгістраваць новую юрыдычную

асобу ў Літве. Выбар Літвы і Вільнюса ў якасці новага месца дыслакацыі быў абумоўлены глыбокім разуменнем літоўскай грамадскасцю і ўладамі Літвы праблем Беларусі і гатоўнасцю дапамагаць дэмакратычным памкненням беларусаў; вялікімі перспектывамі развіцця двухбаковых адносін пасля дэмакратычнага транзіту ў Беларусі і на шляху далучэння Беларусі да ЕС; геаграфічнай, культурнай і гістарычнай блізкасцю Літвы і Беларусі; наяўнасцю ўжо сфармаванага інстытуцыйнага базісу ў сферы адукацыі і даследванняў (Еўрапейскі гуманітарны універсітэт), а таксама нашым сяброўскім стаўленнем да Літвы.

У другой палове 2022 г. мы зарэгістравалі ў Літве публічны інстытут Viešoji įstaiga BEROC tyrimų centras. На дадзены момант ён з'яўляецца адзіным цэнтрам канцэнтрацыі ўсёй нашай дзейнасці і спадкаемцам даследчага цэнтра BEROC. У 2023 г., адкрыўшы разліковы рахунак, мы пачалі рэалізацыю неабходных працэдур у адпаведнасці з законамі Літвы (міграцыйныя, працоўны найм і інш.), каб сканцэнтраваць усю нашу дзейнасць пад эгідай новай юрыдычнай асобы. Да канца 2023 – пачатку 2024 г. мы разлічваем завяршыць усе пазначаныя працэдуры.

На бягучы момант мы здолелі аднавіць звыклы для BEROC маштаб даследчай і адукацыйнай дзейнасці. Больш за тое, мы актыўна працуем над яго пашырэннем. Зараз у стадыі падрыхтоўкі знаходзіцца надзвычай важны для нас праект, які мы імкнемся рэалізаваць супольна з Еўрапейскім гуманітарным універсітэтам – адкрыццё BEROC-IPM School of Economics and Business (BISEB) у якасці філіяла універсітэта.

У нашых планах – у межах BISEB адкрыць бакалаўрскую праграму "Бізнес-эканоміка", а таксама шэраг навучальных бізнес-праграм. Мы чакаем, што рэалізацыя гэтых крокаў стане якасным прарывам для сферы беларускай эканамічнай і бізнес-адукацыі.

Акрамя прафесійнай дзейнасці нашы супрацоўнікі актыўна ўцягнутыя ў грамадзянскую дзейнасць, накіраваную на садзейнічанне дэмакратычнаму транзіту ў Беларусі. Па ініцыятыве BEROC у супрацы з іншымі беларускімі даследчымі цэнтрамі мы запусцілі платформу для абмеркавання будучыні дэмакратычнай Беларусі – Банк ідэй (ideasbank.vision). Найважнейшым пытаннем будучыні Беларусі з'яўляюцца адносіны з Літвой, і тут развіццё беларуска-літоўскага акадэмічнага дыскурсу мае ключавое значэнне. Мы актыўна працуем з беларускім рэлакаваным бізнесам і супрацоўнічаем з іншымі актарамі ў дадзенай сферы. Апроч таго, нашы супрацоўнікі удзельнічаюць у працы дэмакратычных сіл Беларусі.

Два прадстаўнікі BEROC – Павел Данейка і Дзмітры Крук – па-ранейшаму з'яўляюцца членамі калегіяльнага органа дэмакратычных сіл і грамадзянскай супольнасці Беларусі – Каардынацыйнай рады. Нашы супрацоўнікі дапамагаюць кансультацыямі па эканамічнай і іншым тэматыкам Офісу Святланы Ціханоўскай, а таксама іншым суб'ектам дэмакратычных сіл Беларусі.

Мы спадзяемся, што дадзенае кароткае апісанне дае належнае разуменне мэтаў і фармату дзейнасці Viešoji įstaiga BEROC tyrimų centras. Аднак пры жаданні аб усёй дзейнасці цэнтра можна даведацца больш дэталёва. Да дадзенай публічнай заявы мы прыкладаем падрабязную даведку, якая апісвае дзейнасць BEROC.

**Якія прэтэнзіі выстаўляюцца на адрас BEROC?**

Па не цалкам зразумелых для нас прычынах мы сутыкнуліся з нападкамі ў дачыненні дзейнасці нашай арганізацыі і нашага адміністрацыйнага дырэктара Паўла Данэйкі.

Нападкі ў дачыненні да сп. Паўла Данэйкі, імаверна, становяцца дадатковым інструментам да нападкаў на дзейнасць арганізацыі. Гэтыя нападкі грунтуюцца на двух фактах, але са спецыфічнай інтэрпрэтацыяй. Паколькі, тым не менш, нейкая фактычная глеба ў дадзеным выпадку мае месца, мы лічым неабходным даць адпаведныя тлумачэнні.

Усе іншыя нападкі, якія ў завуаляванай форме таксама ўсплывалі, мы цалкам адвяргаем як інсінуацыі, якія не маюць нічога агульнага з рэчаіснасцю.

**Факт 1. Недалікатнае выказванне Паўла Данэйкі аб Літве ў 2019 годзе**

Сапраўды, такі факт быў і такое выказванне сп. Данэйкі захавалася ў інтэрнэце. Па-першае, мы, як арганізацыя, і сп. Данэйка, як прыватная асоба, хочам заявіць, што шкадуем аб гэтым факце і аб такой танальнасці выказвання. Мы завяраем, што, нягледзячы на вастрыню гучання і рэзананс, яно ніякім чынам не азначала і не азначае якога бы ні было негатыўнага стаўлення да Літвы. Сп. Данэйка прыносіць выбачэнні ўсім грамадзянам Літвы, якіх маглі пакрыўдзіць гэтыя словы.

Усведамляючы, што кантэкст гэтага выказвання не адмяняе яго недалікатнасці, мы просім унікнуць ў гэты кантэкст.

У 2019 годзе грамадзянская супольнасць Беларусі лічыла стратэгічна важным інтэнсіфікаваць ўзаемасувязі з ЕС у рамках Усходняга партнэрства. Гэтая пазіцыя грунтавалася на тым, што перыяд вымушанай аўтарытарнай (павольнай і супярэчлівай) мадэрнізацыі магчыма выкарыстоўваць дзеля зніжэння залежнасці Беларусі ад Расіі і закласці інстытуцыйны фундамент дзеля наступнага развіцця адносін з ЕС. Для Літвы важным і вострым пытаннем на парадку дня было пытанне аб беларускай АЭС. Разумеючы экзістэнцыйную важнасць для Літвы (і таксама для Беларусі) пытання бяспекі Астравецкай АЭС, беларуская грамадзянская супольнасць пераважна лічыла, што найбольш рэалістычным спосабам вырашэння гэтага пытання магло б быць уцягванне дыктатара ў інстытуцыйныя адносіны з ЕС у якасці першага кроку. А ўжо пасля, ў межах гэтых адносін, магчыма было б дабіцца адпаведнага выніку. Сярод некаторых літоўскіх палітыкаў перавагу ўзяла іншая тактычная лінія паводзін, якая прадугледжвала ціск на рэжым Лукашэнкі шляхам блакіроўкі падпісання пагадненняў Беларусі ў рамках Усходняга партнёрства.

Гэтая тактычная спрэчка аб тым, якім чынам лепей дасягнуць мэтаў, якія для Літвы і дэмакратычнай супольнасці Беларусі былі аднолькавымі, была дастаткова вострай. Але, пры гэтым, абодва бакі добра разумелі, што вастрыня гэтага пытання і нават магчымы накал у адносінах у сувязі з ёй ніякім чынам не з’яўляюцца пагрозай стратэгічнай арыентацыі на сяброўства і супрацу паміж грамадзянскімі супольнасцямі абедзьвух краін.

Менавіта на гэтым фоне праводзіўся ў 2019 г. круглы стол, на якім прагучала выказванне сп. Данэйкі. Гэта быў закрыты круглы стол (як меркавалася, без удзелу журналістаў, аб іх прысутнасці там удзельнікам стала вядома толькі пастфактум), на якім прысутнічалі палітыкі і грамадзянскія дзеячы Беларусі, Літвы і іншых краін ЭЗ. Фармат прадугледжваў закрыты і непублічны абмен меркаваннямі па гэтым вострым пытанні. Арыентуючыся на закрыты фармат, сп. Данэйка выказаўся вельмі правакацыйна і востра. Ён разглядаў гэта як магчымасць выказаць літоўскім сябрам і партнэрам сваё бачанне па надзённай тактычнай спрэчцы. Так, безумоўна, зварот да такой рыторыкі не надае перавагаў спікеру і крыўдзіць адрасатаў. Але ў той час сп. Данэйка разлічваў такім чынам дагрукацца да літоўскіх партнёраў, даносячы да іх важнасць гэтага пытання для Беларусі. З вялікай імавернасцю ўсе літоўскія партнэры, нягледзячы на рэзкасць выказвання, разумелі ў той момант гэты кантэкст і тое, што гэта выказванне ніяк не адмяняе асабістае добрае стаўленне П. Данэйкі да Літвы і літоўска-беларускаму супрацоўніцтву.

Аб тым, што П. Данэйка з вялікай павагай ставіцца да Літвы, сведчаць яго шматлікія інтэрвью і публікацыі. Ні ў адным з іх (апроч згаданага вышэй выказвання) нельга знайсці нічога сказанага аб Літве ў адмоўнай канатацыі. Наадварот, ёсць шматлікія сведчанні, дзе сп.Данэйка выказвае сваё сяброўскае стаўленне і падкрэслівае паспяховасць досведу Літвы і моцныя якасці літоўскага бізнэсу і літоўскага грамадства. Апроч таго, ўчынкі, імаверна, у найбольшай ступені сведчаць аб рэальным стаўленні. Сп. Данэйка быў ключавым супрацоўнікам BEROC, які

прапанаваў рэлакацыю арганізацыі менавіта ў Літву. Акрамя гэтага, у тым ліку на глебе кансультацый с П. Данэйка, які мае аўтарытэт у беларускіх бізнэсоўцаў, шматлікія бізнэсы прымалі ў апошнія гады рашэнні аб рэлакацыі менавіта ў Літву.

**Факт 2. Удзел П. Данэйкі ў якасці незалежнага дырэктара ў савеце дырэктараў Белгазпрамбанка ў 2018-2022 гг.**

На хвалі інсінуацый гэты факт падаецца як сведчанне сувязяў сп. Данэйкі з Расіяй. Сапраўды, Белгазпрамбанк з'яўляецца банкам з расійскім капіталам (галоўныя акцыянеры - Газпрам і Газпрамбанк). Аднак, доўгія гады расійскія акцыянеры ставіліся да дадзенага банка выключна як да эканамічнага актыву, не разгортваючы ніякіх спробаў праз яго дзейнасць ажыццяўляць уплыў ў палітычнай і іншых сферах. Усе гады старшынства ў гэтым банке Віктара Бабарыкі (2000-2020) дэ-факта менавіта ён быў ключавой асобай, якая прымала стратэгічныя рашэнні. У гады праўлення В. Бабарыкі Белгазпрамбанк быў лідэрам банкаўскага рынку Беларусі не толькі па паказчыках рэнтабельнасці, але і ў тэхналагічным плане, а таксама ў працы з прыватным бізнэсам. Банк актыўна супрацоўнічаў з заходнімі партнёрамі, у тым ліку міжнароднымі фінансавымі інстытутамі. Напрыклад, гэты банк быў адным з галоўных удзельнікаў праграмы Еўрапейскага банка рэканструкцыі і развіцця па падтрымцы малога і сярэдняга прыватнага бізнэсу ў краіне. Банк актыўна укараняў інавацыйныя практыкі і інструменты, стаўшы тэхналагічным піянерам на беларускім фінансавым рынку.

А другой палове 2010-х беларускія ўлады пачалі укараняць у карпаратыўнае кіраўніцтва банкаў інстытут незалежных дырэктараў. На гэтым фоне - з прычыны аўтарытэта П. Данэйкі ў беларускім бізнэс-асяродку, а таксама яго фокусу на інавацыях - Белгазпрамбанк у 2018 годзе запрасіў сп. Данэйку ў склад савета ў якасці незалежнага дырэктара. З улікам моцных іміджавых і рэпутацыйных характарыстык як самога банка, так і старшыні праўлення В. Бабарыкі, П. Данэйка прыняў гэтую прапанову. За перыяд 2018-2022 гг. П. Данэйка здолеў унесці свой унёсак у развіццё банка і ўмацаванне яго стратэгічных пераваг на беларускім фінансавым рынке. У якасці незалежнага дырэктара ён плённа і эфектыўна супрацоўнічаў са старшынём праўлення банка Віктарам Бабарыкай.

Пасля арышту і адмовы ў рэгістрацыі кандыдатам у прэзідэнты Віктара Бабарыкі П. Данэйка заставаўся ў складзе Савета дырэктараў. Галоўнай матывацыяй гэтага былі дапамога ў захаванні ў банку фундамента (каманды, карпаратыўных практык), які быў закладзены В.Бабарыкам, а таксама недапушчэнне злоўжывання з боку рэпрэсіўных органаў рэжыма фактамі і дадзенымі з дзейнасці банка дзеля прыкрыцця палітычнага пераследу В. Бабарыкі. Да сярэдзіны 2021 г. сітуацыя з абвінавачваннямі В.Бабарыкі заставалася падвешанай.

Апошні раз Павел Данэйка удзельнічаў у паседжанні савета дырэктараў банка на пачатку 2021 г. Пасля свайго ад'езду з Беларусі ў ліпені 2021 г. П. Данэйка не браў удзел у паседжаннях савета дырэктараў. Дэ-юрэ паўнамоцтвы сп. Данэйкі ў якасці незалежнага дырэктара скончыліся 28.02.2022. Інфармацыя, якая з'явілася ў СМІ ў чэрвені 2023 г., аб тым, што сп. Данэйка менавіта з гэтага моманту перастаў быць незалежным дырэктарам, не адпавядае рэчаіснасці. Імаверна, гэтая выснова была зроблена СМІ, бо менавіта ў гэты час былі абноўленыя сайт Белгазпрамбанку і старонка аб складзе Савета дырэктараў.

Выкарыстанне факту працы П. Данэйкі ў 2018-2022 ў якасці незалежнага дырэктара ў Белгазпрамбанку як індыкатару нейкай сувязі з Расіяй не вытрымлівае ніякай крытыкі і сведчыць аб карэнным неразуменні рэалій Беларусі ў гэты час.

Сцвярджаем, што ў сп. Данэйкі няма і ніколі не было якіх-небудзь бізнэс- ці палітычных сувязей з расійскімі ўладамі. Уся яго дзейнасць, яго заявы, а галоўнае, учынкі на працягу ўсёй яго кар'еры адназначна сведчаць аб прыхільнасці ідэалам незалежнай дэмакратычнай Беларусі, якая абапіраецца на базавыя еўрапейскія каштоўнасці.

**Нашы далейшыя крокі**

Мы заяўляем, што не бачым ніякіх падстаў мець сумневы ў тым, што дзейнасць BEROC, а таксама афіцыйных асоб арганізацыі базуецца на фундаментальных еўрапейскіх каштоўнасцях і мае сваёй мэтай развіццё чалавечага капіталу Беларусі і Літвы, а таксама на развіццё стратэгічнага супрацоўніцтва нашых краін, паўнавартасную рэалізацыю патэнцыялу двухбаковых эканамічных стасункаў.

Мы верым, што ў Літвы будзе надзейны і прадказальны сусед у асобе Беларусі, і сёння сумесна з літоўскімі калегамі працуем над гэтым.

Мы ўдзячны Літве і літоўцам за падтрымку і абарону нашай арганізацыі, яе супрацоўнікаў і дэмакратычна арыентаваных беларусаў, за прынцыповую пазіцыю па пытанні сумеснай будучыні Беларусі і Літвы як двух раўнапраўных і блізкіх партнёраў, за шматгадовую падтрымку беларускага дэмакратычнага руху. Мы настроены на супрацоўніцтва з Літвой, яе дзяржаўнымі і грамадскімі інстытутамі, сродкамі масавай інфармацыі, грамадзянамі па знішчэнні перашкодаў на шляху да гэтай будучыні, у тым ліку - правакацый і інсінуацый у медыя.

Мы нязменна кіруемся і будзем кіравацца гэтымі ўстаноўкамі, займаючыся даследчай і адукацыйнай дзейнасцю ў галіне эканомікі і бізнесу ў Літве.